# «Парвалася залатаструнне дня...»

Пасля Міколы Дубовіка, аднаго з таленавітых паэтаў-маладнякоўцаў, не захавалася ніводнага фотаздымка, — толькі зборнічак вершаў і некалькі публікацый у калектыўных выданнях. Пражыў ён няпоўныя 23 гады, пахаваны ў брацкіх могілках... А як жа бліскуча пачынаў!

*Парвалася залатаструнне дня,*
*у вячэрняй мгле загаласіла*
*халодная, нямая цішыня*
*і зоры задрыжалі ў цьмянай сіні...*




Нарадзіўся будучы паэт 28 ліпеня 1905 года ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Мурыны Слуцкага павета Мінскай губерні (цяпер в. Каменка Капыльскага раёна Мінскай вобласці). Матэрыяльныя праблемы не перашкодзілі Міколу ў 1923 годзе скончыць агульнаадукацыйныя курсы і паступіць на факультэт грамадскіх навук БДУ. Пасля Мікола перавёўся на літаратурнае аддзяленне педфака. Некалькі разоў кідаў вучобу, таму доўга заставаўся студэнтам — другакурснікам. Вучыўся Мікола, знаходзячыся на ўтрыманні брата. Пасля службы ў Чырвонай Арміі. Падчас купання з ротай студэнтаў-чырвонаармейцаў у Бярэзіне пад Бабруйскам патануў. Вось, бадай, і ўсё, што пра яго вядома.

На жаль, мы не ведаем, можам толькі здагадвацца, што прывяло Міколу ў літаратуру, што натхніла на першыя радкі, калі ён адчуў непераадольны покліч роднага слова. Гісторыя сведчыць, што ў 1925 годзе Мікола стаў дэлегатам І з'езда «Маладняка» з правам дарадчага голасу. З гэтага часу ён актыўна друкуецца. Увайшоў у літаратуру з хваляй маладых, абуджаных рэвалюцыяй творчых сіл. Вельмі любіў паэзію Джорджа Байрана — і ў творах Міколы адчувальны ўплыў гэтага паэта, як і найбольш характэрныя, яркія праявы плыні новага, маладога пакалення: аптымізм, бадзёрасць паэтычнага настрою, захопленасць будаўніцтвам новага. Праўда, на сваім досведзе адчуўшы вастрыню сацыяльных і матэрыяльных праблем, паэт не стаў сляпым апалагетам рэвалюцыі, — у вершах яго адчуваюцца і філасофскі роздум, і ўнутраная заглыбленасць, сузіральнасць:

*Жыццё такая песня — было — няма,*
*жыццё такая песня — сон дзівосны,*
*і хочацца усё абняць:*
*вясну і восень...*

Творчасць Міколы Дубовіка, паводле ўспамінаў Янкі Бобрыка, станавілася «больш індывідуальнай, песімістычнай...». Рэдкімі ў друку ў апошнія гады жыцця М. Дубовіка былі яго вершы.

*Да мураванае сцяны*
*прынікшы ціха, сіратліва*
*стаіць дзіця.*
*У сэрцы холад ад цаглін...*
*Панэль не любіць лілій.*

*Панэль. Ідуць праходзяць людзі,*
*на вуліцы машыны бег...*
*Дзіцяці вочы ў пылу блудзяць,*
*дзіця забылася сябе.*

Ёсць тут штосьці і ад Максіма Багдановіча з яго ўвагай да дзіцячага, нічым не азмрочанага ўнутранага свету, да гарадскіх малюнкаў і адлюстравання таго, што не ляжыць на паверхні, а прыхавана пад вонкавым пластом рэчаіснасці.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў адзіным экзэмпляры захоўваецца зборнік вершаў Міколы Дубовіка на ўкраінскай мове «Вежі», які пабачыў свет у Кіеве ў выдавецтве «Маса». Пад сціплай вокладкай сабраны вершы 1925—1927 гадоў.

**Яна БУДОВІЧ**